| Краіны | 1860 г., % | 1913 г., % |
|---|---|---|
| Вялікабрытанія | 36 | 14 |
| Францыя | 12 | 6 |
| ЗША | 17 | 36 |
| Германія | 16 | 16 |
| Астатні свет | 19 | 28 |

Якія высновы можна зрабіць на падставе прыведзеных статыстычных звестак?

З'яўленне чыгуначных шляхоў зносін не адразу было прыхільна прынятае сучаснікамі. Вось вытрымка з пратэсту, апублікаванага ў адной з англійскіх газет: «У Англіі... птушкі будуць забітыя дымам, у кароў малако сапсуецца і скісне... коні вымруць, пасевы фермераў будуць выпаленыя іскрамі, што па́даюць з лакаматываў; паветра будзе атручанае пахам, які ідзе ад машыны; скаціна, што пасвіцца на палях, памрэ ад страху, пачуўшы гэтыя мярзотныя гукі і свісткі».

*Патлумачце, чаму з'яўленне чыгуначных шляхоў зносін выклікала ў сучаснікаў такі пратэст. Ці спраўдзіліся меркаванні, апублікаваныя ў англійскіх газетах таго часу?*

# § 4. Вялікабрытанія ў XIX — пачатку XX ст.

*1. Калі пачалося фарміраванне парламенцкай манархіі? 2. У якой краіне і калі пачалася прамысловая рэвалюцыя? У чым заключаецца яе сутнасць? 3. Патлумачце значэнне паняццяў «парламенцкая дзяржава», «рэформа», «каланіяльная імперыя».*

Англія выйшла пераможцай з упартай барацьбы, якую вяла супраць Францыі з канца XVIII ст. Аднак, знясіленая войнамі, краіна сутыкнулася з істотнымі эканамічнымі цяжкасцямі.

*Як можна без кровапраліцця вырашаць праблемы, якія паўстаюць у дзяржаве? Якія перавагі мае палітыка рэформаў? Калі і як узніклі прафесійныя саюзы? Чаму Вялікабрытанія ператварылася ў імперыю?*

**1. Эканамічнае развіццё.** Толькі ў 1820-я гг. Англія ўвайшла ў перыяд устойлівага прамысловага ўздыму. Імкліва развівалася тэкстыльная вытворчасць, заўважных

Правообладатель Издательский центр БГУ

29—31

поспехаў дасягнула цяжкая прамысловасць. У 1810—1830-я гг. вытворчасць металу вырасла з 250 да 680 тыс. тон. У 1825 г. першая чыгунка злучыла гарады Стоктан і Дарлінгтан, а праз пяць гадоў — найбуйнейшыя прамысловыя цэнтры краіны Ліверпуль і Манчэстэр. З таго часу сетка чыгунак у Англіі ўвесь час расла. Гэта таксама станоўча паўплывала на эканоміку: выробленыя брытанскай прамысловасцю тавары значна хутчэй перавозіліся па краіне, дастаўляліся ў марскія парты. У дзяржаўную казну паступала больш даходаў ад гандлю.

У 1830—1840-я гг. у Англіі завяршыўся прамысловы пераварот — машыны выцеснілі ручную працу. Пачалося хуткае развіццё капіталізму. Характэрнай рысай эканамічнага ўздыму быў паскораны рост цяжкай прамысловасці, машынабудавання і караблебудавання. У 1840 г. Англія выраблялa 45 % усёй прамысловай прадукцыі. Сёння гэтая лічба выглядае проста фантастычнай: амаль палова ўсіх тавараў свету выпускалася ў параўнальна невялікай краіне.

**2. Дзяржаўны лад.** Напачатку XIX ст. у Вялікабрытаніі склалася канстытуцыйная, або парламенцкая, манархія. Асноўны змест гэтай формы дзяржаўнага ладу выяўляў прынцып: «Кароль уладарыць, але не кіруе». Рэальная ўлада перайшла да парламента, які складаўся з прадстаўнікоў буржуазных партый. Партыя, якая атрымлівала большасць месцаў у палаце абшчын, фарміравала ўрад, або кабінет міністраў, на чале з прэм’ер-міністрам. Урад і суддзі былі незалежныя ад караля. Міністры трымалі адказ толькі перад парламентам.

У Англіі існавала дзве партыі — торы і вігі. Партыя *торы* абараняла інтарэсы буйны́х землеўласнікаў і вышэйшага духавенства, а *вігаў* — буйной гандлёвай і фінансавай буржуазіі. У сярэдзіне XIX ст. на іх аснове склаліся адпаведна Кансерватыўная і Ліберальная партыі.

На 1815 г. выбарчым правам карысталіся толькі 160 тыс. чалавек з амаль 20-мільённага насельніцтва. Правы голасу не мелі рабочыя і многія прадстаўнікі




Дзяржаўны лад у Англіі

Правообладатель Издательский центр БГУ

прамысловай буржуазіі. Невялікія гарадкі, што абязлюдзелі на той час, па-ранейшаму маглі пасылаць у палату дэпутатаў сваіх прадстаўнікоў. Гэтым так званым «гнілым мястэчкам» належала палова месцаў у парламенце, прытым галасамі выбаршчыкаў у такіх гарадках кіраваў гаспадар зямлі — лендлорд. Выбарчая сістэма састарэла і вымагала рэфармавання.

Таму амаль уся першая траціна XIX ст. у Англіі прайшла пад знакам руху за ўсеагульнае выбарчае права і парламенцкую рэформу. Асноўнымі формамі барацьбы сталі дэманстрацыі і масавыя мітынгі. Актыўнымі ўдзельнікамі руху былі рабочыя, што змагаліся за павышэнне заработнай платы і паляпшэнне ўмоў працы. Асцерагаючыся рэвалюцыйнага выбуху, улады пайшлі на саступкі. У 1824 г. яны адмянілі закон, які забараняў працоўныя саюзы. Пасля гэтага ў Англіі пачалі ствараццa **трэд-юніёны** — прафесійныя саюзы, што мелі на мэце абарону інтарэсаў рабочых.

*Якія групы насельніцтва атрымоўвалі новыя магчымасці для ўмацавання свайго становішча ў Англіі ў сувязі з узнікненнем трэд-юніёнаў?*

У 1830 г. да ўлады прыйшла партыя вігаў, якая падрыхтавала законапраект аб парламенцкай рэформе. Нягледзячы на ўпартае супраціўленне лендлордаў у абедзвюх палатах парламента, Біль аб рэформе быў прыняты. *Парламенцкая рэформа 1832 г.* скарачала прывілеі палаты лордаў, пазбаўляла права прадстаўніцтва большасць «гнілых мястэчак». Месца ў парламенце атрымоўвалі толькі буйны́я прамысловыя цэнтры. Аднак высокі маёмасны цэнз (абмежаванне ў правах) пазбаўляў выбарчых правоў рабочых і дробных уласнікаў. Ніжэйшыя пласты насельніцтва не маглі трапіць у парламент. Захоўвалася адкрытае галасаванне, што дазволіла лендлордам па-ранейшаму ўплываць на вынік выбараў. Выбарчая рэформа 1832 г. забяспечыла перавагу ў парламенце прамысловай буржуазіі.

**3. Рабочы рух. Чартызм.** У **1834 г.** быў прыняты *закон аб бедных*. Паводле гэтага закона спецыяльны падатак, які спаганяўся з прадпрымальнікаў на карысць бедных, адмяняўся. Усе, хто жыў у нястачы, накіроўваліся ў работныя дамы, умовы жыцця ў якіх мала чым адрозніваліся ад турэмнага зняволення. Праца да знямогі і галеча былі лёсам значнай часткі беднага люду Вялікабрытаніі. Маламаёмныя пласты насельніцтва лічылі, што менавіта іх прадстаўнікі ў парламенце здолеюць нешта змяніць у лепшы бок.

Гэтыя спадзяванні спарадзілі масавы рабочы рух 1830—1850-х гг. за выбарчую рэформу — *чартызм* (ад анг. *charter* — грамата, хартыя).




28—29

Членскі білет трэд-юніёна рабочых газавых заводаў. Канец XIX ст.

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Прычыны ўзнікнення**

- крызіс у эканоміцы
- захаванне палітычнай бяспраўнасці рабочых пасля парламенцкай рэформы 1832 г.
- антырабочая палітыка ўрада

Прычыны ўзнікнення чартызму

У **1838 г.** чартысты апублікавалі «Народную хартыю» — праект увядзення ўсеагульнага выбарчага права для мужчын. Першую петыцыю (прашэнне) аб «Народнай хартыі» падпісалі больш за 1 млн чалавек. Яна была дастаўленая ў парламент, але палата абшчын адхіліла яе. Той жа лёс чакаў яшчэ дзве петыцыі. І кожны раз, калі парламент адхіляў іх, краіну ахоплівалі дэманстрацыі, мітынгі, стачачны рух. Улады адказвалі рэпрэсіямі і арыштамі кіраўнікоў чартыстаў.

*Выкарыстоўваючы карту на с. 4 атласа, раскажыце, дзе і чаму адбываліся масавыя выступленні рабочых.*

Большасць чартыстаў былі прыхільнікамі негвалтоўных метадаў барацьбы. Але некаторыя выступалі за выкарыстанне «фізічнай сілы», г. зн. за рэвалюцыйнае пераўтварэнне палітычнага і сацыяльнага ладу, за ліквідацыю эканамічнай і палітычнай няроўнасці. У 1848 г. сталі гучаць заклікі да ўзброенага паўстання. Аднак у Лондан былі ўведзеныя войскі, і запланаваныя маніфестацыі не адбыліся. Адначасова ўрад пайшоў на саступкі — скараціў да 10 гадзін працоўны дзень, абмежаваў дзіцячую працу, павысіў заработную плату кваліфікаваным рабочым. Разумеючы непазбежнасць рэформаў, урад пазней адмяніў маёмасны цэнз для дэпутатаў парламента і ўвёў тайнае галасаванне. Усё дарослае мужчынскае насельніцтва атрымала права голасу. Гэтыя пераўтварэнні ўзмацнялі веру працоўных у магчымасць паляпшэння свайго становішча шляхам рэформаў.

*Абмяркуйце эфектыўнасць метадаў, што выкарыстоўваліся чартыстамі для дасягнення сваіх мэт. Сфармулюйце вывад.*

**4. Унутраная палітыка ў другой палове XIX — пачатку XX ст.** У 1850—1870-я гг. Вялікабрытанія ўвайшла ў паласу эканамічнага росквіту. Гэтая дзяржава ператварылася ў вялізную каланіяльную імперыю, якую пачалі называць майстэрняй свету. Яе сусветная магутнасць адлюстравалася ў словах нацыянальнага гімна: «Кіруй, Брытанія, на морах!»

Правообладатель Издательский центр БГУ

У краіне канчаткова склалася двухпартыйная сістэма. Кожная з дзвюх **палітычных партый** — то Кансерватыўная, то Ліберальная — па чарзе прыходзіла да ўлады ў палаце абшчын. Сур'ёзных разыходжанняў паміж імі не было. Абедзве ўсведамлялі неабходнасць здзяйснення рэформаў у адпаведнасці з духам часу.

Лідар кансерватараў Б. Дызраэлі і лідар лібералаў У. Гладстан сталі ініцыятарамі рэформаў, што праводзіліся ў 1860—1880-х гг. Спачатку кансерватары, а пасля лібералы правялі праз парламент два законы аб выбарчай рэформе, у выніку якой колькасць выбаршчыкаў вырасла да 5,5 млн чалавек. Праўда, жанчыны права голасу так і не атрымалі. Былі прынятыя таксама законы аб трэд-юніёнах, якія далі права на судовую абарону і правядзенне стачак, аб тайным галасаванні пры выбарах у парламент, аб 54-гадзінным рабочым тыдні і забароне прымаць на працу дзяцей, маладзейшых за 10 гадоў.

Напрыканцы XIX ст. трэд-юніёны актывізавалі сваю дзейнасць і паступова пачалі ўцягвацца ў палітычную барацьбу. Рабочыя патрабавалі пераходу на 8-гадзінны працоўны дзень, увядзення пенсійнага забеспячэння, свайго прадстаўніцтва ў парламенце. У 1900 г. самая масавая прафсаюзная арганізацыя — *Брытанскі кангрэс трэд-юніёнаў (БКТ)*, заснаваная яшчэ ў 1868 г., стварыла Камітэт рабочага прадстаўніцтва. У 1906 г. апошні быў пераўтвораны ў *Лейбарысцкую партыю*. Так у Вялікабрытаніі з'явілася *сацыялістычная партыя*.

Уздым рабочага руху прымусіў кіроўныя колы Вялікабрытаніі пайсці на здзяйсненне новых сацыяльных рэформаў. Ініцыятарам пераўтварэнняў у імя класавага міру стаў прадстаўнік Ліберальнай партыі Д. Лойд Джордж, які ўвайшоў у склад урада ў 1905 г., а пасля і ўзначаліў яго. Лібералы правялі праз парламент законы аб увядзенні матэрыяльнай дапамогі пасля няшчасных выпадкаў на вытворчасці і пенсіі для людзей, якія дасягнулі 70 гадоў, аб страхаванні па хваробе, інваліднасці і беспрацоўі, аб усталяванні 8-гадзіннага працоўнага дня для гарнякоў.

**5. Знешняя палітыка.** Вядомы брытанскі дыпламат лорд Пальмерстан вызначаў асноўныя прынцыпы знешняй палітыкі Вялікабрытаніі наступным чынам: «Мы не маем ні вечных саюзнікаў, ні сталых сяброў, але вечныя і пастаянныя нашыя інтарэсы, і бараніць іх — наш абавязак».

26—28

Брытанскія дыпламаты процідзейнічалі ўзвышэнню то Францыі, то Расіі, то Германіі, бачачы ў іх асобе сваіх супернікаў, прэтэндэнтаў на лідарства ў Еўропе. У саюзе з Францыяй і Турцыяй Вялікабрытанія нанесла паражэнне Расіі ў Крымскай вайне сярэдзіны XIX ст., а пасля падтрымлівала Італію ў барацьбе супраць Францыі ў перыяд кіравання імператара Напалеона III. Калі ж стаў відавочны рост магутнасці аб'яднанай Германіі, Вялікабрытанія падтрымала намаганні Францыі, якая імкнулася да стварэння антыгерманскага ваенна-палітычнага блока. Спярша быў заключаны ваенны саюз з Францыяй (1904), а затым падпісанае пагадненне з Расіяй (1907).

Істотнай асаблівасцю брытанскай знешняй палітыкі ў XIX — пачатку XX ст. быў яе каланіяльны характар. Краіна вяла захопніцкія войны ў Індыі, Кітаі, Іране

Правообладатель Издательский центр БГУ

і Афганістане. Напачатку 1850-х гг. Вялікабрытанія захапіла Паўднёвую Бірму, а пасля і ўсю Малаю. Адначасова працягваліся каланізацыя Аўстраліі і Новай Зеландыі, асваенне Канады.

У **1876 г.** каралева Вікторыя была абвешчаная імператрыцай Індыі. Так Вялікабрытанія стала імперыяй. Барацьба за пашырэнне каланіяльных уладанняў узмацнілася ў 1880—1890-я гг. Англічане акупавалі Егіпет, авалодалі Бірмай у Азіі, Нігерыяй, часткай Самалі, Кеніяй і іншымі тэрыторыямі ў Афрыцы. Каланізацыя Паўднёвай Афрыкі прывяла да вайны з бурамі — нашчадкамі галандскіх, французскіх і нямецкіх каланістаў. Каланіяльныя захопы суправаджаліся прапагандай перавагі белага чалавека над народамі азіяцкіх і афрыканскіх краін.

*Выкарыстоўваючы картасхему на 2-м форзацы вучэбнага дапаможніка, дакажыце каланіяльны характар знешняй палітыкі Вялікабрытаніі.*

Напачатку XX ст. Брытанская імперыя займала тэрыторыю ў 35 млн км$^2$ з насельніцтвам больш за 400 млн чалавек. Барацьба за захаванне гэтай імперыі стала адной з прычын Першай сусветнай вайны.



Брытанскія войскі ў Кітаі. Малюнак сярэдзіны XIX ст.

Правообладатель Издательский центр БГУ

***Ключавыя словы**: трэд-юніён, чартызм, палітычная партыя.*

1. Падрыхтуйце разгорнуты план адказу на тэму «Эканамічнае развіццё Англіі ў XIX — пачатку XX ст.».
2. Складзіце схему найвышэйшых органаў улады Вялікабрытаніі. Назавіце форму дзяржаўнага ладу гэтай краіны.
3. Параўнайце дзейнасць трэд-юніёнаў з чартызмам і выявіце адрозненне.
4. Калі ўзніклі БКТ і Лейбарысцкая партыя? Што яны мелі на мэце?
5. Што прымусіла Вялікабрытанію ўступіць у саюзныя адносіны з Францыяй і Расіяй?
6. Якое значэнне Вялікабрытанія надавала каланіяльнай палітыцы? Якімі былі вынікі гэтай палітыкі? Пры адказе карыстайцеся картасхемай на 2-м форзацы вучэбнага дапаможніка.

У 1880 г. ірландскія арандатары ўпершыню скарысталі як шлях барацьбы за паляпшэнне свайго становішча адкрытае непадпарадкаванне (спыненне працы) у дачыненні да кіраўніка — англічаніна Ч. К. Бойката. Ад той пары слова «байкот» атрымала пашырэнне ва ўсіх мовах свету.

*Як вы лічыце, ці з'яўляецца байкот эфектыўным (дзейсным) сродкам барацьбы? Свой адказ абгрунтуйце.*

# § 5. Францыя ў XIX — пачатку XX ст.

*1. Якімі былі рашэнні Венскага кангрэса ў дачыненні Францыі? 2. Што значыць паняцце «імперыялізм»?*

У адрозненне ад Англіі Францыя не пазбегла рэвалюцыйных хваляванняў. У XIX ст. краіна перажыла 4 рэвалюцыі (усяго на адну меней, чым Іспанія) і толькі пасля гэтага стала на шлях эвалюцыйнага развіцця.

*Якія прычыны ляжалі ў аснове рэвалюцыйных узрушэнняў у Францыі ў XIX ст.? Як у гэтай краіне канчаткова замацавалася рэспубліканская форма кіравання?*

**1. Эканамічнае і палітычнае развіццё.** Эканамічнае развіццё Францыі праходзіла пад уплывам прамысловай рэвалюцыі. У краіне з'явіліся фабрыкі, будаваліся чыгункі. Аднак індустрыяльны прагрэс быў больш павольны, чым у Англіі. Развіццё цяжкай прамысловасці (вытворчасць машын) ішло з адставаннем. Аб'ёмы здабычы вугалю ўзрасталі, але яго ўсё адно не хапала. Таму вугаль даводзілася ўвозіць з-за мяжы. Аднак

Правообладатель Издательский центр БГУ